В основе антирейтинга мировых курортов лежат отзывы самих отдыхающих, в том числе россиян. Британская страховая компания Norwich Union Travel Insurance, представившая список потенциально опасных мест, опросила более 60 тысяч курортников и проанализировала несчастные случаи, произошедшие с туристами в разных уголках мира.

Так, возглавляет черный список Таиланд. В основном туристов тянет в Бангкок, Паттайю и Пхукет. Впрочем, на экзотическом курорте отпускников подстерегают вполне прозаические неприятности. Это лихие водители, некачественные продукты и шустрые воры. Опытные путешественники советуют не гулять по Таиланду в одиночку, не пить воду из-под крана и не покупать еду на улице.

Между тем в последнее время Таиланд стал очень популярным среди россиян. По данным Ростуризма, в 2009 году сюда съездили 233 тысячи россиян, а за первые четыре месяца этого года -- уже более 157 тысяч.

На втором месте оказалась страна, столицу которой все футбольные болельщики теперь произносят без запинки, -- ЮАР. Здесь главное недовольство отдыхающих вызывает высокий уровень преступности. Оставлять вещи без присмотра нельзя ни на секунду, да и личная безопасность легко может оказаться под угрозой.

Третье место занял Барбадос, расположенный на одноименном острове. Но здесь многочисленных туристов, которые едут сюда ради серфинга, поджидают другие опасности. Существует высокий риск наткнуться на ядовитых тропических насекомых.

Далее идет Индия. Подхватить инфекцию здесь не составит никакого труда. Чистота и безопасность местных водоемов даже при первом взгляде вызывает большие сомнения. Плюс к этому -- огромное количество насекомых, которые переносят различные заболевания.

Между тем самые популярные сегодня среди российских туристов страны, такие как Турция, Египет, Финляндия или Израиль, не попали в черный список курортов.

Мільён подпісаў за адстаўку ўрада

Мільён казахстанцаў падпісаліся пад маніфестам апазіцыі, якія запатрабавалі роспуску парламента і адстаўкі ўрада.

Такія дадзеныя, як паведамляе сайт "Фергана.Ру", апублікавала Аб'яднаная сацыял-дэмакратычная партыя (АСДП) "Азат", якая займалася зборам подпісаў. Усяго ў Казахстане пражываюць больш за 15 мільёнаў чалавек.

Дзеючы ўрад апазіцыянеры лічаць "марыянеткавым", а існуючы ў краіне аднапартыйны парламент — нелегітымным. Нагадаем, што пасля выбараў 2007 года ў ніжняй палаце парламента была толькі адна партыя — кіруючая "Нур Отан" ("Святло Айчыны"), лідэрам якой з'яўляецца прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў.

У дакумент, распрацаваны апазіцыяй, уключаны і патрабаванні эканамічнага характару. Апазіцыянеры заяўляюць, што новы парламент і ўрад, якія прыйдуць на змену ранейшым, павінны спыніць рост коштаў, падвоіць зарплаты, пенсіі і стыпендыі, наладзіць масавае будаўніцтва даступнага жылля.

Змяніць урад і парламент, на думку АСДП, павінен прэзідэнт. У партыі спадзяюцца, што ён "прыслухаецца да голасу казахстанцаў", а таксама *"ўсведамляе сваю долю адказнасці за рост сацыяльнага напружання"*.

Збор подпісаў, як заяўляюць у партыі, будзе працягнуты.

Европарламент предлагает изменить механизм помощи Афганистану

В Европейском парламенте представлен доклад о новой стратегии международной помощи Афганистану. Заместитель главы делегации Европарламента по связям с Афганистаном Пино Арлаччи призвал пересмотреть сам механизм оказания помощи этой стране. По его оценке, ее эффективность подрывается коррупцией и плохим управлением. "80 процентов денег, выделяемых международным сообществом для Афганистана, не доходит до афганцев", -- сказал Арлаччи.

В докладе предлагается упростить многоступенчатую структуру оказания помощи, обеспечить полную прозрачность, чтобы можно было судить о ее распределении и результатах, максимально отказаться от услуг частных структур, завышающих свои тарифы и нередко способствующих своими действиями коррупции.

ОНИ — О НАС

Он замучил Москву и Брюссель

Москва и Брюссель готовы объединить свои усилия в деле устранения Александра Лукашенко с поста президента Беларуси, хотя их взгляды на политические события на постсоветском пространстве редко совпадают, полагает журнал Newsweek.

Предпочтительно, чтобы Лукашенко ушел после очередных президентских выборов, которые должны будут пройти в начале 2011 года.

Европейский Союз давно критиковал Лукашенко за преследования оппозиционных активистов и цензуру местных СМИ. Но теперь Лукашенко оттолкнул и своего великого покровителя — Россию. Кроме того, Лукашенко отказался признать независимость Абхазии и Южной Осетии, несмотря на давление Кремля. Он также предоставил убежище Курманбеку Бакиеву, которого, как утверждает журнал, Россия помогла свергнуть с поста президента Киргизии. Теперь у Кремля наконец закончилось терпение, объясняет белорусский оппозиционер Александр Козулин. *"Россия вложила 50 млрд долларов в режим Лукашенко, но он по-прежнему не ведет себя как верноподданный"*, — заявил он.

Newsweek и ранее утверждал, что Кремль не против избавиться от строптивого белорусского президента. В мае издание утверждало, что Москва уже подыскала замену Лукашенко — якобы для этих целей выбран белорусский оппозиционер Андрей Санников, не слишком близкий с Западом.

Отношения между Москвой и Минском вновь обострились после того, как телеканал НТВ показал документальный фильм о Лукашенко, где президент Беларуси обвиняется в почтительном отношении к Гитлеру и в убийстве своих политических оппонентов. Могут последовать и другие материалы подобного типа — поскольку российские телеканалы принимаются во многих белорусских домах, они могут сильно повредить популярности президента, указывает Newsweek.

В это же время Евросоюз ведет собственную игру: недавно он смягчил ограничения на поездки должностных лиц республики и предложил расширить торговлю и другие формы сотрудничества. Все готово к решающему сражению между Востоком и Западом за будущее Беларуси — общим мотивом для обеих сторон будет ненависть к Лукашенко, говорится в статье.

Но пока президент пользуется народной поддержкой: значительная часть белорусов будет голосовать за Лукашенко, даже считая, что он не выражает их интересов. Судя по всему, оппозиции белорусы доверяют еще меньше.

Попробуй нарушить!

Страны Евросоюза, нарушившие финансовую дисциплину и превысившие установленные нормы дефицита госбюджета, столкнутся с серьезными санкциями.

Как сообщает агентство AFP, на прошедшей в Брюсселе встрече министров финансов было принято решение лишать нарушителей субсидий. После заседания председатель Европейского совета Херман ван Ромпей сообщил, что планируется существенно усилить контроль за исполнением бюджета, а также расширить арсенал санкций. Начиная с 2011 года, Брюссель будет проводить проверки уже в первом полугодии, чтобы заранее выявлять возможные проблемы.

Решение о введении более жестких мер в отношении нарушителей было принято на саммите ЕС в июне нынешнего года, напоминает агентство Reuters. Поводом стал острый финансовый и экономический кризис в Греции. После встречи в верхах Европейская комиссия занялась разработкой конкретных мер. В частности, допустившие бюджетные нарушения страны будут вынуждены вносить в качестве залога довольно крупные суммы. Кроме того, нарушителям не будет выделяться финансовая помощь из структурного и аграрного фондов ЕС.

Между тем правительство Германии продолжает настаивать на введении, помимо экономических, и политических санкций. По мнению Берлина, страны, превысившие установленные Пактом стабильности нормы дефицита бюджета, нужно лишать права голоса при принятии решений. Однако до сих пор большинство членов Евросоюза выступают против такого решения. В то же время ван Ромпей отметил, что дискуссии о возможном введении "не экономических" санкций будут продолжены.

Дзве лэдзі

Жонка прэзідэнта Францыі Карла Бруні сустрэлася з першай лэдзі Нігера. *Фота AFP.*

ВЗГЛЯД С ЗАПАДА

Европа получит сразу пять Чернобылей

После чернобыльской катастрофы лет двадцать никто и слышать не хотел о новых атомных станциях. Сейчас совсем недалеко от саркофага Чернобыльской АЭС планируется строительство сразу пяти: по одной в Беларуси, Литве и Калининградской области, а в Польше — сразу двух. Не опасно ли возведение на небольшом густонаселенном пятачке такого количества источников сверхвысокой опасности? Оправданно ли это экономически?

Рост экологических требований, вроде необходимости сокращения выброса CO2 ради предотвращения изменения климата, привел к тому, что многие вновь стали причислять уран к возобновляемым источникам энергии. Еврокомиссия говорит о необходимости развития атомной энергетики. МАГАТЭ считает, что к 2030 году в Восточной Европе АЭС будут давать вдвое больше электроэнергии, чем сейчас. На сайте "Немецкой волны" изложено мнение по этому вопросу берлинского политолога, эксперта Института европейской политики Северина Фишера. Знакомим с ним наших читателей.

В энергетической политике в Восточной Европе привыкли видеть не рыночный инструмент, как в западных странах, а фактор, необходимый для усиления своего влияния, своей роли, отмечает Фишер. Он полагает, что если эту ситуацию не удастся изменить, если силовые факторы будут и дальше играть слишком большую роль, то проблема со временем еще больше обострится, а электричество станет дороже, поскольку каждый из участников думает только о себе, о своих интересах. Объединение усилий, сотрудничество, напротив, ведут к повышению эффективности и росту прибыли, снижению расходов, прежде всего на строительство АЭС.

Северин Фишер не сомневается, что если спрос на то количество электроэнергии, которое могут дать эти АЭС, будет научно доказан, то и инвесторы с помощью тендеров найдутся. В России, Беларуси наверняка это будет решено иначе, чем в государствах ЕС, где в последние годы энергетический рынок стал либеральнее, но есть стремление проводить единую энергетическую политику, полагает берлинский политолог Фишер. Он убежден, что если бы страны-соседи думали о долгосрочной перспективе, руководствовались бы рыночными критериями, определили бы потребность в электроэнергии, увязали требования безопасности, то наилучшее решение было бы найдено совместными усилиями всех заинтересованных шести стран. Но это маловероятно, поскольку каждая из стран пришла к этой проблеме своим путем.

В Польше желание строить АЭС объясняется прежде всего экологическими требованиями, существующими в ЕС. А это значит, что уголь здесь не имеет перспективы. Поэтому Польша, равно как и Эстония, должны думать о реструктуризации энергосектора. В Калининградской области после отключения Игналинской АЭС также возник дефицит электроэнергии. Более того, поскольку страны Балтии вошли в ЕС и были интегрированы в европейские энергосети, перестала существовать энергосеть, созданная в советское время. Минск в своем стремлении к независимости хочет иметь свою АЭС.

Какие же перспективы существуют для этих АЭС, если они, конечно, будут построены? Северин Фишер, берлинский эксперт, работающий и в экологической комиссии Европарламента, выделяет два аспекта — экономика и безопасность. Зная потенциальные потребности региона, Фишер убежден, что пяти АЭС для этого пятачка уже слишком много.

Правда, судя по опубликованным планам, все эти станции должны будут работать и на экспорт, то есть снабжать электричеством Европу. Иными словами, уже сейчас закладывается высокий уровень конкуренции между ними, а значит, и невозможность высоких цен. То есть и здесь, если бы они хотели иметь больше выгоды, то должны были бы договориться о кооперации.

Скептицизм Северина Фишера по отношению к этим стройкам объясняется и тем, что неясно, как будет обеспечена безопасность АЭС — это вообще самый сложный вопрос, к которому примыкают и все остальные. Как создать единые и обязательные для всех нормы безопасности эксплуатации реакторов? Как добиться, чтобы и Россия, и Беларусь соответствовали требованиям ЕС, членами которой являются Литва и Польша?

Где и как хранить ядерные отходы? Этот вопрос вообще нигде в мире еще не решен. Могильников никто на своей территории строить не хочет, а временные хранилища создают массу постоянных проблем и дополнительных опасностей.

Это хорошо показывает опыт Германии, где уроки Чернобыля и сделанные из них экологические выводы во многом определяют политику страны, в том числе и энергетическую. Поэтому Германия решила постепенно отказаться от своих АЭС. Однако рост цен на традиционные источники энергии и борьба за сокращение выброса CO_2 ради предотвращения изменения климата явно заставляет и немцев думать о продлении срока жизни АЭС.

Виктор АГАЕВ.

Найдите летчика

Правительство Боливии ищет международного пилота с налетом не менее 100 часов для нового самолета президента страны Эво Моралеса. Об этом сообщает РИА "Новости" со ссылкой на боливийскую радиостанцию Erbol.

Самолет Dassault Falcon 900Ex Easy прибыл в столицу Боливии Ла-Пас 2 июля из США, но пилотировать его некому. *"В стране нет пилота, частного или из ВВС Боливии, который мог бы управлять данным аппаратом. У прошедших стажировку на заводе-изготовителе самолета боливийцев нет допуска на пилотирование этой модели. Поэтому мы приглашаем на работу иностранного летчика с налетом не менее 100 часов"*, — заявил журналистам на пресс-конференции глава администрации президента в ранге министра Оскар Кока.

По его словам, в дальнейшем законтрактованный пилот подготовит местный персонал для управления самолетом президента. Ранее сообщалось, что подписанный боливийскими властями с корпорацией Dassault контракт предусматривает, среди прочего, специальную подготовку четырех членов экипажа и четырех техников.

В настоящее время президент Боливии использует небольшой самолет Sabreliner NA-265, приобретенный в 1975 году.

Между тем боливийские власти не намерены отказываться и от уже согласованного предложения о покупке в России за 30 миллионов долларов президентского "борта" Ан-148 в счет кредита из Москвы. "Мы купим Ан-148, но он будет изготовлен в соответствии с нашими техническими требованиями только через 24 месяца. А новый самолет для Эво Моралеса нужен уже сегодня", — сообщил ранее министр экономики и финансов Боливии Луис Арсе.

ТАМ, ГДЕ ДИКТАТУРА

Окружение сознательно дезинформирует вождя

В КНДР готовится смена власти, причем, по всей видимости, тяжелобольной лидер страны Ким Чен Ир уже не в состоянии управлять происходящим, а его окружение сознательно дезинформирует вождя относительно реального положения дел в стране, пишет журнал "Огонек" со ссылкой на южнокорейскую газету Chosun Ilbo. Как отмечает источник, на столь стремительный процесс перехода власти к сыну Ким Чен Уну северокорейский лидер не рассчитывал.

По данным источника, приближенные к Ким Чен Ира лица преподносят ему выборочную или вовсе неверную информацию под предлогом заботы о его здоровье. В конце июня та же газета писала, что у Ким Чен Ира после перенесенного в 2008 году инсульта появились признаки маразма.

Как пишет Chosun Ilbo, над частью докладов, которые готовят для вождя, 27-летний Ким Чен Ун работает лично. Также, по некоторым сведениям, Ким Чен Иру стало известно о подтасовке фактов, и он распорядился передавать ему информацию только через доверенных секретарей в обход сына. Как тщательно выполняется это указание, неизвестно.

Как ранее заявляли эксперты, вождь в КНДР должен смениться в начале сентября, когда в стране состоится партконференция Трудовой партии Кореи. В ходе этого мероприятия партия изберет новое руководство. Как отмечают аналитики, на предыдущем подобном форуме, прошедшем 30 лет назад, Ким Чен Ир был провозглашен наследником своего отца — Ким Ир Сена.

О вероятном преемнике СМИ знают очень мало. Известно, что Ким Чен Ун родился в Пхеньяне 8 января 1982 года — с этого года его день рождения стал государственным праздником. Матерью Ким Чен Уна является неофициальная жена главы КНДР Ко Ен Хи. Она родилась в Японии, занималась балетным искусством и скончалась несколько лет назад — по одной версии, от рака, по другой — после ДТП.

Согласно данным южнокорейских источников, будущий возможный лидер КНДР очень похож на отца: он страдает лишним весом, гипертонией и диабетом. По слухам, отец и сын любят вместе смотреть, как перед ними под западную музыку выступают обнаженные танцовщицы.

Ким Чен Ун учился в Международной школе в Швейцарии, он также является страстным поклонником игры в баскетбол. В Пхеньян Ким Чен Ун вернулся после учебы в возрасте 20 лет. О том, что он станет возможным преемником, СМИ заговорили два года назад, после того, как в августе 2008 года Ким Чен Ир перенес тяжелый инсульт.

В апреле прошлого года Ким Чен Ун был назначен членом Государственного комитета обороны КНДР, а летом стал главой разведывательного агентства. Писала пресса и об активных действиях наследника вождя по продвижению наверх — так сообщалось о планах Ким Чен Уна провести чистку среди сторонников своего старшего брата, 39-летнего Ким Чен Нама. Младшего сына даже обвиняли в организации заговора с целью убийства брата, который может также претендовать на пост вождя. В прошлом году аналитики разведки Южной Кореи сообщали, что Ким Чен Ир якобы провозгласил Ким Чен Уна своим преемником.

По мнению экспертов, о том, что в КНДР готовится передача власти, косвенно свидетельствует также и тот факт, что с начала нынешнего лета в Пхеньяне стали слагать стихи и песни в честь наследника Ким Чен Ира.

В начале июня стало известно о значительных перестановках в верхних эшелонах власти Северной Кореи. В частности, Ким Чен Ир отправил в отставку премьер-министра КНДР Ким Ен Ира и назначил на этот пост своего зятя — мужа 35-летней дочери Ким Сер Сон. Председателем совета министров стал главный секретарь пхеньянского комитета Трудовой партии Кореи Чхве Ен Рим. Северокорейский лидер также назначил мужа своей сестры Чан Сон Тхэка заместителем председателя Государственного комитета обороны. Как считают эксперты, родственное окружение во власти должно помочь сыну вождя быстрее адаптироваться к новой роли.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
16—19 ЛІПЕНЯ 2010 г.

РАЗВІТАННЕ

Вялікае сэрца

Слова пра Маргарыту Ермалаеўну ПАЛАЧАНІНУ, якая памерла з «Народнай Воляй» у руках

Бываюць людзі (не мною толькі заўважана), пры знаёмстве з якімі, пасля першых жа некалькіх слоў, беспамылкова ўгадваеш: свой, блізкі, родны... Так і з Маргарытай Ермалаеўнай Палачанінай. Колькі год таму сустрэліся на выхадзе пасля вечарыны ў Доме літаратара, які тады яшчэ не быў адабраны ўладамі ў беларускіх пісьменнікаў, загаварылі — і падалося, што знаёмыя з ёю ўжо тысячу год: шчырая, ззяючая ўсмешка на ўвесь твар, іскрыстыя вочы, нешта сонечнае, што прабівалася на свет з самой глыбіні яе істоты. І першае ўражанне толькі ўзмацнялася з цягам часу, да самых апошніх яе імгненняў на гэтай зямлі.

Тры дні таму, тыя, хто меў шчаслівы гонар быць яе сябрамі, з глыбокім болем і жалем развіталіся з гэтай цудоўнай жанчынай. Яна была ўвасабленнем таго, як можа ўпрыгожыць і асвятліць жыццё вакол сябе, пакінуць незабыўны след у людскіх душах самы на першы погляд звычайны, просты — без усялякіх рэгаліяў і пасад - чалавек. Канечне, калі ён — Чалавек, які жыве не адно толькі дзеля сябе, любімага. Многія, узяўшы слова на жалобным развітанні, проста не маглі гаварыць — горла душылі слёзы. Але гэта было красамоўней самых узвышаных слоў.

Між тым сама Маргарыта Ермалаеўна, зазвычай такая гаваркая, адкрытая, эмацыянальная, не любіла, не ў прыклад іншым, словаахвотным немаладым людзям, засяроджвацца на сабе. Амаль усё — пра дарагіх, родных, знаёмых і незнаёмых, уразіўшых пры сустрэчы. Чым? Дабрынёй, спагадай, увагай, на дэфіцыт якіх мы так часта скардзімся, а самі... Яна ж, здавалася, сваёй дабрынёй і абаяльнасцю, бы магніт, прыцягвала нечым падобных да сябе, часам зусім выпадковых сустрэчных. Вось дзеліцца ў начной тэлефоннай размове ўражаннямі ад канцэрта ў філармоніі, а на пытанне, чаму ж дадому дабралася намнога пазней за мяне, ускліквае: "Ой, з такім чалавекам пазнаёмілася! Сяджу пры перасадцы на аўтобусным прыпынку — аўтобуса няма і няма, народу назбіралася — процьма! І тут — уявіце сабе, пад'язджае легкавік, яго абступілі, просяць падвезці. "Прабачце, але я не таксіст, — кажа ўладальнік, — а хачу падвезці вось гэтую жанчыну...". І нечакана падыходзіць да мяне: "Вы ж, заўважыў, з палачкай, вам цяжка будзе ўбіцца ў транспарт, калі прыйдзе — так што вельмі прашу, калі ласка. А наконт грошай не турбуйцеся — нізашто не вазьму!"

Іншым разам — у тым жа духу: "Кульгаю-клыпаю з прадуктовай сумкай, нага зусім раздурылася. Даганяюць двое — хлопец з дзяўчынай. Падхапілі маю ношку, хоць і не прасіла, данеслі дадому, паднялі на паверх, да самых дзвярэй кватэры. Падзякавала ад душы. А мы на моладзь наракаем... Якія бацькі, такія і дзеці, дабро ж за сабой дабро вядзе".

Яна і не думала, што сама пра сябе кажа, пра сваю гісторыю, хоць адмыслова расказаць яе не паспела. У апошняй размове — можа, нешта прадчуваючы, мімаходзь прызналася з уздыхам: "Чамусьці згубіла сон, мінулае-перажытае так і паўстае перад вачыма. Вось бы запісаць, што помніцца, ды, баюся, ужо не здолею. І навошта, такое ж перажылі і тысячы — тысячы іншых, такі ўжо лёс нашай зямлі выпаў".

Што б магла распавесці, каб усё ж узялася за пяро, былая дзяўчынка з вёскі на Аршаншчыне? Напэўна, пра сваё, як, сапраўды, і ў тысячы тысяч равеснікаў, басаногае, але незабыўнае маленства, гвалтоўна абарванае лютай ваеннай навалай? Пра тое, як падлеткам, пры вызваленні Беларусі ад акупантаў, апынулася на перадавой лініі наступаючых часцей Чырвонай Арміі, пад асколкамі варожых снарадаў, дапамагаючы, чым толькі магла, нашым ваярам? У свае юныя гады стала байцом працоўнага фронту, а потым з годнасцю, але без шуму і крыкаў (хіба такое не бывае?) насіла заслужанае званне ветэрана Айчыннай вайны. І ў мірны час, загартаваная агнём, з не меншай мужнасцю і адвагай прабівалася скрозь усе цяжкасці і нястачы пасляваеннай пары (хто са старэйшых іх не ведае?), да навукі, каб здзейсніць сваю мару і стаць настаўніцай.

І яна стала ёю (як і многія іншыя), але якой! Яе неадольная прага да новых і новых ведаў, радасць спазнання дагэтуль неспазнанага перадавалася вучням, якія лавілі кожнае слова старэйшага (часта ненамнога) сябра. Маргарыту Ермалаеўну Палачаніну — выкладчыцу беларускай, рускай і нямецкай моў і дагэтуль не забылі даўнія выпускнікі школ на Лагойшчыне і ў іншых мясцінах.

Тое ж было і ў Мінску, дзе яна на пачатку 60-х апынулася са сваёй дачушкай Галяй, стала працаваць выхавальніцай у школе-інтэрнаце для сірот і цяжкіх падлеткаў. У кожным яна бачыла і паважала паўнавартасную асобу, развівала разумовыя і творчыя здольнасці, эстэтычны густ, вучыла жыць па праўдзе і справядлівасці, быць чуйнымі да ўсяго навокал. Не давала ім сумаваць, ладзіла цікавыя паходы і экскурсіі, наладжвала развіваючыя гульні, захапляла цікавымі гісторыямі. Атуляла сваім крылом ад казённай чэрствасці некаторых калег, ад крыўдных, абразлівых слоў у бок дзетак, і без таго абдзеленых лёсам. Гадаванцы верылі ёй і плацілі любоўю за любоў — яна ж ставілася да іх гэтаксама, як і да ўласнага дзіцяці. Галіна Вашчанка, дачка Маргарыты Ермалаеўны, у кнізе ўспамінаў "Беларусь у сэрцы" піша: "Усім лепшым, што ёсць у маёй душы, я абавязана маме і табе, беларуская прырода... Усё гэта любіла мама і перадавала гэтую сваю любоў, шкадуючы кожную зламаную галінку, радуючыся вясёлцы і дажджу, краскам у полі і знойдзенаму баравіку ў лесе". Яна любіла кнігі, мастацтва і заўсёды выкройвала са сціплага заробку грошы на білеты ў тэатр з нязменнай спадарожніцай Галінкай.

А жылі яны ў горадзе — без падмогі ніадкуль — па праўдзе, вельмі бедна. Калі дзяўчынка, засумаваўшы па маці, якая з ранку да ночы прападала ў інтэрнаце, прыбягала туды да яе, то дзялілі пароўну "службовы" настаўніцкі абед. Маргарыта Ермалаеўна аднойчы прызналася, што не можа дараваць сабе дачушкавы слёзы, прычынай якіх міжволі стала аднойчы. Дзіця плакала, калі яе самая лепшая, самая прыгожая ў свеце мама прадавала сваё новае, яшчэ з біркай, кітайскае паліто, з цяжкасцю набытае з капеечнай эканоміі замест старога, дашчэнту зношанага... Але духоўнае багацце, душэўная шчодрасць і дзейсная дабрыня — гэтага ў іх ніхто і ніколі не мог адняць.

Маці ганарылася сваёй дачкой, якая прадоўжыла яе шлях, стала філолагам. А галоўнае — сапраўдным чалавекам, адданым патрыётам Беларусі, руплівіцай на ніве нацыянальнага Адраджэння з канца 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Ганарылася, што дачка прыйшла пад бел-чырвона-белы сцяг Беларускага Народнага Фронту, стала верным аднадумцам і паплечнікам лідэра Нацыянальнага руху Зянона Пазьняка, а затым і яго жонкай. Не іх воля, што дзеці (так называла Галіну і Зянона) і адданейшыя дзеці Бацькаўшчыны, мусілі апынуцца за межамі роднай зямлі. Але не страцілі сваёй вернасці і любові да Беларусі, свайго грамадзянскага змагарнага духу і па-ранейшаму жывуць дзеля Айчыны, несупынным клопатам і барацьбой за яе светлую будучыню.

Такой жа гарачай верай у заўтрашні дзень Радзімы заўжды жыла і Маргарыта Ермалаеўна. Аб гэтым пранікнёна гаварылі на развітанні з ёю выконваючы абавязкі старшыні Кансерватыўна-Хрысціянскай партыі — БНФ Юрась Беленькі, намеснік старшыні Сяргей Папкоў, навукоўцы Вольга Кузьміч, Іосіф Тэкушэвіч і шмат хто іншы. Надзея Якаўлеўна Невідовіч, якая калісьці дала прытулак у сваім доме перасяленцам з вёскі і якую звязала з Маргарытай Ермалаеўнай амаль паўвека блізкага сяброўства, ціха плакала, не ў стане прамаўляць. Яе выручыла дачка Наталля, якая шануе "цётку Рыту" нароўні з уласнай мамай.

Канечне ж, не маглі не згадваць пра няўрымслівую, поўную гаючай энергіі і жыццялюбства натуру шмат перажыўшай жанчыны, якая, насуперак некалькім перанесеным інфарктам і грузу іншых цяжкіх хвароб нават у свае 83 была, а не здавалася, маладзейшай за іншых маладых. Яна прагнула жыць у нястрымным руху (і непаслухмяныя ногі не былі памехай), імкнулася дапамагчы ўсім і кожнаму, проста-такі кідалася насустрач чужой бядзе. Ды і не існавала для яе чужога болю. Падавалася, толькі і занята клопатам, як і чым, хоць драбніцай, каго адарыць, сагрэць цяплом свайго вялікага сэрца. І кожны мог пацвердзіць гэта мноствам пераканаўчых прыкладаў.

Многіх захапляе шырыня яе інтарэсаў. Да апошняга дня Маргарыта Ермалаеўна "ператэатралівала" любога запіснога, штатнага мастацтвазнаўцу ў сваіх ледзь не штодзённых наведваннях розных спектакляў, канцэртаў, выстаў, сустрэч з пісьменнікамі і навукоўцамі ў сядзібе Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны. Шмат чытала — і класікаў, і сучасных беларускіх творцаў, цікавілася ўсім, што адбываецца ў свеце і асабліва — роднай Беларусі, "Народную Волю" прачытвала ад першага да апошняга радка, трапна і нераўнадушна каментуючы прачытанае. І калі бліжэйшыя сябры, устрывожаныя тым, што тэлефон Маргарыты Ермалаеўны маўчыць ужо дні два, адамкнулі дзверы яе кватэры, то ўбачылі неверагодную карціну: бездыханная ўжо гаспадыня сядзела, бы жывая, на канапе, з разгорнутай любімай газетай у руках... Відаць, смерць была літасцівай да яе — імгненнай.

Дакараю сабе, што некалькі дзён перад тым, толькі што вярнуўшыся з водпуску і патэлефанаваўшы Маргарыце Ермалаеўне, на яе прапанову адправіцца вечарам у Оперны на Грузінскі балет, я нешта мармытала, спасылаючыся па сваёй дурноце на тое, што, маўляў, зараз "не ў форме" і што напрадзе нас чакае яшчэ шмат цікавых відовішчаў... Аказалася ж вось якая непапраўная бяда...

Хавалі жанчыну з вялікім сэрцам пад бел-чырвона-белым сцягам.

За памінальным сталом, за якім і гаравалі і радаваліся, што, адышоўшы ў іншы свет, Маргарыта Ермалаеўна пакінула нам часцінку свайго цяпла і святла, пачулі раптам з мабільніка здалёк скрушны і пяшчотны голас Галіны Ватчанка, а затым і Зянона Пазьняка, якія сардэчна дзякавалі добрым людзям, што падтрымлівалі, атулялі клопатам дарагога чалавека.

І згадваліся мудрыя словы святара уніяцкай царквы, які служыў жалобную імшу ў памяць памерлай:

— Гавораць, смерць мацней за ўсё і ўсё ёй падуладна. Не! Мацней за смерць — любоў, яна перажывае зямнога чалавека і дае нам сілу.

А потым хлынуў цёплы летні лівень — як слёзы з нябёс, што змяшаліся з людскімі ачышчальнымі слязьмі...

Святлана КЛІМЕНЦЕНКА.

СПАДЧЫНА

Сцёртая памяць пра Грунвальд

Дзяржава пакуль ніяк не рэагуе на прапановы грамадства па ўвекавечанні ў Мінску памяці герояў Грунвальда, заявіў у інтэрв'ю БелаПАН намеснік старшыні нацыянальнага грамадскага аргкамітэта па святкаванні 600-годдзя перамогі пад Грунвальдам, мастак Мікола Купава.

Паводле яго слоў, на працягу года аргкамітэт пад старшынствам доктара гістарычных навук, прафесара Анатоля Грыцкевіча неаднаразова звяртаўся па гэтай тэме ва ўладныя структуры — да старшыні Савета міністраў, у Адміністрацыю прэзідэнта, да кіраўніка дзяржавы, старшыні Мінгарвыканкама і міністра культуры.

"У сваіх зваротах мы прапаноўвалі закласці помнік у гонар герояў Грунвальда на сталічных плошчах Мяснікова ці Юбілейнай, а таксама перайменаваць адну з іх у плошчу імя Грунвальдскай перамогі. Узнімалася пытанне пра перайменаванне шэрагу сталічных вуліц, у тым ліку Савецкай, Камуністычнай і Фрунзе, а таксама праспекта Дзяржынскага ў гонар Вітаўта Вялікага, караля Ягайлы, князёў Лугвена Мсціслаўскага, Юрыя Лугвенавіча і Жыгімонта Карыбутавіча. А на тэрыторыі старога сада паміж вуліцамі Максіма Танка, Кальварыйскай і Ціміразева мы прапанавалі закласці парк імя Вітаўта Вялікага", — сказаў Купава.

Паводле яго слоў, на ўсе прапановы аргкамітэт пакуль не атрымаў ніякага адказу.

СТЫХІЯ

Ахвяры лета

Ад навальніц, дажджу і парываў ветру 13 ліпеня пацярпела 57 населеных пунктаў у 22 раёнах Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай абласцей і Мінску.

Як паведаміў БелаПАН прэс-сакратар Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Віталь Навіцкі, пашкоджаны дахі 50 жылых дамоў, 99 сельскагаспадарчых будынкаў. Абясточаны 341 населены пункт, у 43 з іх электразабеспячэнне пакуль не адноўлена.

У Мінску з-за падзення дрэў падчас навальніцы пашкоджана восем легкавых аўтамабіляў. Напярэдадні вечарам дрэвы, якія ўпалі, перакрылі выезд з тэрыторыі падстанцыі № 6 Гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі, а будаўнічыя лясы, якія ўпалі, закрылі выхад з магазіна "Аўтазапчасткі" па вул. Кіжаватава, дзе знаходзіліся чатыры чалавекі. У абодвух выпадках ратавальнікі апаратыўна ліквідавалі наступствы стыхіі.

Акрамя таго, паводле аператыўных звестак МНС, стыхія стала прычынай смерці і траўмавання людзей. 13 ліпеня каля вёскі Зялёны Сад Гомельскага раёна на летняй пашы ўдарам маланкі быў смяротна траўмаваны пастух. Каля вёскі Сялец Лідскага раёна ў лесе на дзевяцігадовага хлопчыка ўпала верхавіна дрэва. Ён шпіталізаваны з траўмамі рознай ступені цяжкасці. У Мінску ад дрэў, што ўпалі, пацярпелі два чалавекі, якія таксама трапілі ў бальніцу з траўмамі рознай ступені цяжкасці.

КОНКУРС

Нашы ў Галівудзе

Каманда беларускіх музыкантаў возьме ўдзел у Сусветным чэмпіянаце выканальніцкіх майстэрстваў, які пройдзе ў Галівудзе. Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Мінску паведаміла кіраўнік беларускай каманды Маргарыта Корзун.

Паводле яе слоў, Беларусь на конкурсе прадставяць лаўрэаты і дыпламанты міжнародных творчых конкурсаў. Яны выступяць у трох асноўных катэгорыях конкурсу: вакал — Пётр Ялфімаў (Мінск) і Дзіяна Громава (Гомель), танец — ансамбль "Палеская зорачка" (Мазыр) і інструментальная музыка — баяніст Павел Неўмяржыцкі (Мінск). Кожны з беларускіх канкурсантаў выступіць у некалькіх намінацыях чэмпіянату. Пры гэтым у паўфінале кожнаму ўдзельніку на выступленне даецца толькі хвіліна.

Як паведаміла Корзун, на чэмпіянаце існуюць каля 60 намінацый у васьмі ўзроставых катэгорыях. Канкурсанты спаборнічаюць за залатыя, сярэбраныя і бронзавыя медалі і за галоўныя ўзнагароды — тытулы "Гранд-чэмпіён свету", якіх уручаюцца толькі два — у старэйшай і малодшай узроставай катэгорыі. Апрача таго, на чэмпіянаце разыгрываюцца граны на навучанне ў прэстыжных школах танца, кіно і тэлебачання ЗША. Летась заяўкі на ўдзел у чэмпіянаце адправілі больш як 75 тыс. выканаўцаў з 50 краін.

Паводле слоў Корзун, у нацыянальны аргкамітэт конкурсу было пададзена прыкладна 120 заявак, 40 з іх былі дасланыя на суд арганізатараў конкурсу ў ЗША. У мінулыя гады, паводле яе звестак, у чэмпіянаце брала ўдзел толькі адна прадстаўніца Беларусі — Вольга Неўдах — уладальніца тытулу "Міс-Беларусь — 2002". Корзун сказала, што ў будучым годзе плануецца пашырыць нацыянальны адбор канкурсантаў.

Сусветны чэмпіянат выканальніцкіх майстэрстваў пройдзе ў ЗША ў 14-ы раз. Жыхары Беларусі могуць убачыць фінал чэмпіянату ў анлайн-трансляцыі на сайце www.wcopa.tv. Апрача ўдзелу ў чэмпіянаце беларуская каманда плануе правесці творчыя сустрэчы з беларускай, польскай, рускай дыяспарамі, а таксама шэраг сустрэч з агентамі, прадзюсерамі і прадстаўнікамі шоу-індустрыі з мэтай прасоўвання беларускіх выканаўцаў. Паездка на чэмпіянат беларускай каманды аплачваецца за кошт асабістых сродкаў удзельнікаў і спонсарскай дапамогі, сказала Корзун.

Таццяна ДАРАШЧОНАК, БелаПАН.

ДАВЕДАЧНАЕ БЮРО СПАЖЫЎЦОЎ

На пытанні чытачоў даюць адказы спецыялісты грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства абароны спажыўцоў"

Вярніце паліто

У атэлье няякасна вырабілі паліто з майго матэрыялу. Перарабіць немагчыма. Што можна прад'явіць атэлье?

Алена Жымойцік, г.Мінск.

— Спажывец мае права звярнуцца з заявай на імя загадчыцы (загадчыка) атэлье з патрабаваннем вырабіць новае паліто з аналагічнага матэрыялу за лік атэлье альбо вярнуць заплачаную суму за паслугу і кампенсаваць кошт сапсаванай тканіны з улікам індэксацыі.

«Парамантавалі»...

Боты аддалі ў майстэрню дзеля таго, каб паставілі новыя набойкі. У выніку работы раскалолі абцас. Што рабіць?

Паліна Летава, Мінскі раён.

— Спажывец мае права заявіць патрабаванне аб замене абцаса. У выпадку немагчымасці гэта зрабіць — патрабуйце прадастаўленне аналагічнай мадэлі абутку альбо каменсацыі кошту абутку.

Паверым спецыялісту

Як вызначаецца працэнт зносу рэчы, якая прымаецца ў рамонт?

Сяргей Свецін, г.Віцебск.

— Працэнт зносу рэчы, якая прымаецца ў рамонт, вызначаецца спецыялістам, які прымае рэч па ўзгадненні з заказчыкам.

Не можаце патрапіць у пад'езд?

У пад'ездзе паставілі дамафон. Я быў супраць і паслугу не аплачваў. Зараз не толькі адзін я не магу патрапіць у свой пад'езд. Як быць?

Яўген Сямёнаў, г.Мінск.

— Навязваць вам паслугу ніхто не мае права. Спажыўцу, нават калі і паставілі новыя дзверы і дамафон, павінны бясплатна выдаць камплект ключоў.

Не трэба крыўдзіць жонку

Купіў у падарунак жонцы паліто. Не падышло па памеры. Ці можна яго вярнуць назад і атрымаць грошы?

Аляксандр Паўлаў, г.Маладзечна.

— Спажывец мае права на працягу 14 дзён з моманту набыцця патрабаваць замену тавара належнай якасці на аналагічны, калі тавар не падышоў яму па памеры, колеры, фасону, і калі пры гэтым рэч не была ва ўжыванні, захаваўся яе таварны выгляд, ярлыкі, этыкетка. Пры адсутнасці замены спажывец мае права патрабаваць вярнуць яму назад суму, якую той заплаціў.

Дык што ж такое нітраты?

Раскажыце, калі ласка, больш падрабязна пра нітраты. У чым заключаецца небяспечнасць ужывання прадуктаў з нітратамі? І калі такі прадукт купілі, то ці можна яго ўжываць?

Антон Падольскі, г.Мінск

— Нітраты — солі азотнай кіслаты — нармальныя прадукты абмену азоцістых рэчаў арганізма. Аднак пры празмерным ужыванні яны часткова аднаўляюцца да больш таксічных злучэнняў — нітратаў, якія могуць выклікаць атручэнне, парушэнне абмену рэчаў. Акрамя таго, у прысутнасці амінаў, з нітратаў могуць атрымацца нітразаміны — канцэрагенныя злучэнні, якія спрыяюць развіццю рака. Пры прыёме высокіх доз нітратаў з пітной вадой і прадуктамі праз 4—6 гадзін з'яўляецца рвота, адышка, пасіненне скураных і слізістых пакроваў. Усё гэта суправаджаецца агульнай слабасцю, галавакружэннем, стратай прытомнасці, галаўным болем, стратай працаздольнасці.

Спажывец павінен ведаць, што пры цеплавой апрацоўцы частка нітратаў разбураецца, частка пераходзіць у адвар, таму адвар не рэкамендуецца ўжываць. Пры варцы бульбы ў вадзе 20—40 працэнтаў нітратаў пераходзіць у адвар, пры паравой варцы - 30—70 працэнтаў. Пры смажанні на патэльні — 15%. Пры варцы морквы колькасць мінеральнага азоту зніжаецца напалову. У буйных бураках, якія звараны цалкам, колькасць нітратаў зніжаецца прыкладна на 20%. У таматным соку, які прайшоў тэрмічную апрацоўку, колькасць нітратаў зніжаецца ў 2 разы. Пры пакупцы ранняй зеляніны варта выбіраць толькі цэлыя лісты салату, шпінату альбо пятрушкі. Нітразаміны звычайна ўзнікаюць падчас тэрмічнай апрацоўкі і захоўванні прадуктаў — пры вэнджанні, саленні, марынаванні, кансервіроўцы з прымяненнем нітратаў, высушванні прадукцыі кантактным спосабам. Больш за ўсё яны ўтрымліваюцца ў вэнджанай рыбе, каўбасных вырабах. З малочных прадуктаў найбольш "небяспечныя" сыры, якія прайшлі фазу ферментацыі. З раслінных — салёныя марынаваныя вырабы, а з напіткаў — піва. Таму з пункту гледжання бяспекі такія прадукты спажываць можна, але патрохі і не вельмі часта.

Шпалеры розныя душу не радуюць

Купілі шпалеры аднаго артыкула. Аказалася, што яны адрозніваюцца па тоне (3 трубкі цямнейшыя за астатнія). У магазіне адмовіліся мяняць шпалеры, спасылаючыся на тое, што іх ужо не мяняюць і не вяртаюць. Ці так гэта?

Святлана Саўчыц, г.Драгічын.

— Шпалеры на самай справе ўключаны ў Пералік тавараў, якія не падлягаюць абмену і вяртанню. Аднак у гэтым выпадку гутарка ідзе аб дабраякасных таварах, якія не падышлі спажыўцу па нейкіх прычынах (напрыклад, не падышлі да інтэр'ера). Адрозненні па тоне з'яўляюцца недахопам, і таму патрабаванне спажыўца павінна быць задаволена.

Калі панчохі нестандартныя

Купіла панчохі. На ўпакоўцы ўказаны адзін памер, а на самай справе — другі. Ці можна вярнуць такі тавар?

Марыя Давідовіч, Вілейскі раён.

— Так, такі тавар можна вярнуць на той падставе, што была прадастаўлена няправільная інфармацыя аб спажывецкіх якасцях тавара.

Мэблю не вернеш

Купілі канапу і крэслы. Прывезлі дадому, а яны не падыходзяць. Ці можна іх вярнуць назад?

Аляксандр Піменаў, г.Мінск.

— Нельга, бо дабраякасная мэбля абмену і вяртанню не падлягае.

А куртачка фарбуе!

Купіла на рынку скураную куртку. Як аказалася, куртка фарбуе рэчы, якія апранаеш пад яе. Якія патрабаванні можна прад'явіць і каму — прадаўцу ці вытворцу?

Паліна Нікітчанка, Слонімскі раён.

— Няўстойлівасць фарбавальніка з'яўляецца бракам вытворчага характару. Спажывец мае права прад'явіць патрабаванні альбо прадаўцу, альбо вытворцу аб скасаванні дамовы куплі-продажу і кампенсацыю ўрону, які быў нанесены яму няякасным таварам.

Адчуйце розніцу!

Пры пакупцы дыетычных курыных яек я звярнула ўвагу прадаўца на тое, што ў суадносінасці з нанесенай маркіроўкай на яйку, з таго моманту, як яго знесла курыца, прайшло два тыдні, і яйка не можа быць дыетычным. На што прадавец мне адказала, што тэрмін вартасці яек дыетычных — 30 дзён. Ці так гэта?

Вікторыя Паўлоўская, г.Магілёў.

— Тэрмін вартасці яек можа дасягаць 30 дзён, аднак дыетычным яйка застаецца на працягу 7 сутак з таго моманту, як яго знесла курыца. Пасля 7 сутак яйка пераходзіць у катэгорыю сталовага. Паколькі якасць яек дыетычных і сталовых адрозніваецца, то і кошт дыетычнага яйка большы, чым сталовага.

Падрыхтаваў Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ДЗІКУНСТВА

Забілі і спалілі

Пракуратура Магілёўскай вобласці распачала крымінальную справу па факце забойства і спальвання пенсіянера.

Як паведаміла БелаПАН старшы памочнік пракурора Магілёўскай вобласці Ала Кузняцова, устаноўлена, што жыхар Мінска 1981 года і два жыхары Бабруйска 1988-га і 1992 гадоў нараджэння ў нежылым дачным доміку, што ў вёсцы Чырвонае Асіповіцкага раёна, забілі і спалілі мясцовага жыхара, пенсіянера 1946 года нараджэння.

Уцякаючы з месца ўчынення злачынства, зламыснікі ўгналі аўтамабіль і былі затрыманы супрацоўнікамі міліцыі.

Пракуратура вобласці распачала крымінальную справу ў дачыненні да гэтых трох чалавек па прыкметах злачынства, прадугледжанага на падставе п.6. ч.2 арт.139 (забойства з асаблівай жорсткасцю).

Папярэдняе расследаванне праводзіцца следчым аддзелам пракуратуры Магілёўскай вобласці.

СЛЕДСТВИЕ

Арестован замдиректора Гомельского станкостроительного завода

Уголовное дело возбуждено Главным управлением по борьбе с организованной преступностью и коррупцией МВД Беларуси.

Как пояснили в ГУБОПиК МВД, арест стал возможен в результате проведения оперативных мероприятий на РУП "Гомельский станкостроительный завод". Оперативники ГУБОПиК МВД обратили внимание, что один из руководителей крупного предприятия живет не по средствам, в то время как сам завод находится не в лучшем финансовом положении.

"У нас нет такого, что мы конкретно смотрим, кто на какой машине приезжает, но когда поступает информация, мы ее проверяем. Вот в ходе такой проверки нами и был выявлен факт коррупции на заводе", — рассказали в ГУБОПиК МВД интернет-изданию "Ежедневник".

По словам оперативника, арестованный заместитель генерального директора по своим должностным обязанностям отвечал за недвижимость, которая находилась в собственности предприятия. Именно на этом коррупция и расцвела.

Как сообщили в ГУБОПиК МВД, замдиректора был сначала задержан по подозрению в получении 10 тысяч евро от одного столичного бизнесмена. Якобы деньги были получены за положительное решение вопроса о предоставлении в аренду производственного помещения предприятия. Но вскоре после задержания стали известны и другие некрасивые факты, касающиеся сдачи в аренду помещений завода.

На самом предприятии отказались комментировать ситуацию.

ПОНЕДЕЛЬНИК, 19 ИЮЛЯ

Первый

06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 “Новости”.
06.05, 07.10, 08.15 “Доброе утро, Беларусь!”.
07.05, 08.10, 18.50, 01.00 “Зона Х”.
07.30, 08.25, 11.50 “Деловая жизнь”.
08.30 “В мире моторов”.
09.05 “Nota Bene”.
09.35 “Здоровье”.
10.05 “Жизнь как жизнь”.
11.05, 17.30 “Не родись красивой”. Сериал.
12.10 “Супергеройское кино”. Худ.фильм.
13.40 “Моя правда”. “Светлана Крючкова. Женщина-воин”. Док.цикл.
14.30 “В погоне за мечтой”.
15.15, 19.15 “Новости региона”.
15.25 “Доярка из Хацапетовки. Вызов судьбе”. Сериал.
16.30 “Всегда говори “всегда”-2”. Сериал.
18.25 “Прости меня”.
19.25 “КЕНО”.
19.30 “Легко сказать”. Галина Орлова.
19.55 “Участок”. Сериал.
21.00 “Панорама”.
21.15 “Мгла”. Худ.фильм.
00.15 “Герои-3”. Сериал.
01.05 “День спорта”.

ОНТ

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05, 01.05 “Наши новости”.
06.05 “Наше утро”.
09.05 “Контуры”.
10.10, 11.10 “Города... Герои...”. Ленинград.
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20, 01.20 “Новости спорта”.
11.30 “Моя жена меня приворожила”. Сериал.
12.00 “Малахов +”.
13.10 “Понять. Простить”.
13.40 “Модный приговор”.
14.45 “Контрольная закупка”.
15.30 “Хочу знать” с Михаилом Ширвиндтом”.
16.15 “Обручальное кольцо”. Сериал.
18.20 “Счастливы вместе”. Сериал.
19.35 “Земельный вопрос”.
21.00 “Панорама”.
21.55 “В бегах”. Худ.фильм.
23.40 “Герои-3”. Сериал.

НТВ-Беларусь

07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25 “Сегодня”.
07.05 “Сегодня утром”.
08.30 “Таксист”. Сериал.
09.15 “Чистосердечное признание”.
10.20 “Кулинарный поединок”.
11.20 “Русские сенсации”.
12.05 “Криминальное видео”. Сериал.
13.30 “Супруги”. Сериал.
15.05 “Профессия — репортер”.
15.35, 18.35 “Обзор. Чрезвычайное происшествие”.
16.30 “Улицы разбитых фонарей”. Сериал.
19.35 “Столица греха”. Сериал.
21.35 “Глухарь”. Сериал.
23.50 “Школа”. Сериал.
00.20 “Олимпийские тайны России”.

СТВ

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 “24 часа”.
06.10, 17.20 “Минщина”.
06.20, 07.45 “Утро. Студия хорошего настроения”.
07.40, 20.10 “СТВ-спорт”.
08.30 “Неделя”.
09.35 “Большой завтрак”.
10.05 “Личный интерес” с Павлом Кореневским”.
10.40 “Ангел-хранитель”. Сериал.
11.40, 17.30 “Званый ужин”.
12.35, 18.30 “Мачеха”. Сериал.
13.50 “Большой город”.
14.30 Концерт Михаила Задорнова”.
15.35 “Звездный ринг”.
16.50 “Репортерские истории”.
17.10 “Наше дело”.
20.00 “Столичные подробности”.
20.20 “Добрый вечер, малыш!”.
20.40 “Связь”. Худ.фильм.
22.55 “Столичный футбол”.
23.25 “Пятый элемент”. Худ.фильм.

ЛАД

07.00 “ЛАДное утро”.
08.00, 21.20 “Универ”. Сериал.
08.30, 16.25 “Час суда. Дела семейные”.
09.25, 18.00 “Любовь как любовь”. Сериал.
10.30 “Коля — перекати поле”. Сериал.
12.15 “Пра мастацтва”.
12.45 “Школа ремонта”.
13.50, 16.50, 18.50, 00.05 “Новости — Беларусь”.
14.25 “О самом главном”. Ток-шоу.
15.20 “Осенние заботы”. Худ.фильм.
17.15 “Кулагин и партнеры”. Сериал.
17.50 “Кармелита. Цыганская страсть”. Сериал.
20.30 “Вера, Надежда, Любовь”. Сериал.
22.20 “Дворик”. Сериал.
22.55 “Каменская”. Сериал.
23.50 “Ничего личного”.
00.30 “Городок”.

НТВ-Беларусь

07.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.25 “Сегодня”.
07.05 “Сегодня утром”.
08.30 “Таксист”. Сериал.
09.15 “Чистосердечное признание”.
10.20 “Кулинарный поединок”.
11.20 “Русские сенсации”.
12.05 “Криминальное видео”. Сериал.
13.30 “Супруги”. Сериал.
15.05 “Профессия — репортер”.
15.35, 18.35 “Обзор. Чрезвычайное происшествие”.
16.30 “Улицы разбитых фонарей”. Сериал.
19.35 “Столица греха”. Сериал.
21.35 “Глухарь”. Сериал.
23.50 “Школа”. Сериал.
00.20 “Олимпийские тайны России”.

СТВ

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 “24 часа”.
06.10, 17.20 “Минщина”.
